Варшава, Польшча

08–09 жніўня

# Канферэнцыя Новая Беларусь‘26

Панэль 1

# «Не чакаць, а ствараць новае вакно магчымасцяў»

## *Выклікі. Стратэгія. Прыярытэты*

Сітуацыя ў Беларусі і вакол яе дынамічна змяняецца. Амерыканцам удалося вызваліць палітычных зняволеных, у Гаазе распачалася справа супраць Лукашэнкі, Расія зазнае ўдары па сваёй тэрыторыі, а рэжым змякчае праваенную рыторыку. Пры гэтым рэпрэсіі працягваюцца, хоць і змяняюць свае формы.

Усё гэта стварае для дэмакратычных сіл не толькі новыя выклікі, але і новыя магчымасці. Як перахапіць палітычную ініцыятыву і змяніць статус-кво?

**Мадэратарка:** *Роза Турарбекава, доктарка навук, экспертка ў галіне міжнародных адносін*

**Спікеры(-кі):**

**Святлана Ціханоўская,** *абраная прэзідэнтка Беларусі, кіраўніца Аб’яднанага Пераходнага Кабінета*

**Віктар Бабарыка,** *беларускі грамадскі і палітычны лідар*

**Павел Латушка,** *намеснік кіраўніцы Аб’яднанага Пераходнага Кабінета, кіраўнік Народнага антыкрызіснага ўпраўлення*

**Павел Севярынец,** *сустаршыня Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, пісьменнік, былы палітвязень*

**Арцём Брухан,** *спікер Каардынацыйнай Рады*

---

**Святлана Ціханоўская** пачала панэль, адзначыўшы, што развіццё сітуацыі ў Беларусі залежыць не толькі ад дэмакратычных сіл, але і ад знешніх фактараў, галоўным з якіх застаецца вайна ва Украіне. Паводле яе, будучае вакно магчымасцяў непасрэдна залежыць ад сілы Украіны, адзінства Еўропы і дзеянняў ЗША. Ціханоўская адзначыла важнасць таго, каб вызваленне палітычных зняволеных не прывяло да зняцця санкцый і легітымізацыі рэжыму Лукашэнкі без рэальных палітычных зменаў. Вяртанне да «business as usual» можа часткова спыніць гібрыдныя пагрозы, але не прывядзе да доўгатэрміновых пераменаў. Ціханоўская адзначыла, што дэмакратычныя сілы будуць працаваць з любымі новымі ўрадамі і тлумачыць ім, што дэмакратычная Беларусь — гэта таксама пытанне іх уласнай бяспекі. Стратэгія ў дачыненні да Беларусі павінна быць больш шырокай і доўгатэрміновай, чым толькі вызваленне палітычных зняволеных і ўдзел беларускіх добраахвотнікаў у абароне Украіны. Ціханоўская падкрэсліла важнасць прыцягнення рэжыму да адказнасці і захавання санкцыйнага ціску.

**Павел Латушка** падкрэсліў важнасць трох элементаў стратэгіі дэмакратычных сіл: ціску на рэжым праз санкцыі, прыцягнення вінаватых да адказнасці і падрыхтоўкі да транзіту ўлады. Ён нагадаў пра памылкі 2013–2016 гадоў, калі Захад паверыў Лукашэнку і пайшоў на збліжэнне з рэжымам без удзелу апазіцыі на фоне перамоў па Украіне. Латушка прапанаваў рыхтавацца да сцэнару новых глабальных мірных перамоў. У такім выпадку адначасова з міжнароднымі перамовамі павінны адбывацца перамовы па вырашэнні беларускага крызісу з удзелам ЗША і ЕС. Дэмакратычныя сілы таксама мусяць выступаць суб’ектам такіх працэсаў. Перадумовамі

«вакна магчымасцей» Латушка назваў чатыры фактары: комплексны крызіс, які ўжо існуе; аснову для выхаду з яго ў выглядзе падтрымкі ідэі незалежнасці; усведамленне прагматычнымі людзьмі ўнутры рэжыму неабходнасці пераменаў; і паслабленне Расіі як галоўнага донара рэжыму.

**Віктар Бабарыка** перанёс фокус дыскусіі са знешніх фактараў на ўнутраныя праблемы дэмакратычных сіл. Ён паставіў пытанне аб тым, якую рэальную каштоўнасць дэмсілы сёння прапануюць беларускаму грамадству. Паводле Бабарыкі, беларусаў унутры краіны цяпер мала цікавіць тое, што адбываецца ў дэмакратычнай супольнасці. Таму неабходна адказаць на пытанне, чаму мільёны грамадзян павінны выбраць менавіта тых людзей, якія сёння знаходзяцца на гэтай сцэне, — і трэба працаваць над тым, каб людзі ў Беларусі зноў больш цікавіліся дзейнасцю дэмакратычных сіл.

**Павел Севярынец** папярэдзіў, што вакно магчымасцяў можа адкрыцца раптоўна і вельмі імкліва — напрыклад, у выпадку краху сістэмы ў Расіі, да якога можа прывесці, напрыклад, новая хваля мабілізацыі. Паводле Севярынца, дэмакратычныя сілы гатовыя да такога развіцця падзей у сферах дыпламатыі і медыя, але значна менш падрыхтаваныя ў пытаннях ваеннай бяспекі. Севярынец заклікаў працаваць з беларускімі добраахвотнікамі і ўжо цяпер фармаваць кадравы рэзерв — людзей, якія ў выпадку пераменаў змогуць вярнуцца ў Беларусь і ўдзельнічаць у правядзенні рэформаў.

Асобна мадэратарка закранула праблему русіфікацыі і спытала **Паўла Севярынца**, ці магчыма супраціўляцца ёй і ці не варта адкласці пытанне беларусізацыі да лепшых часоў. Севярынец катэгарычна выступіў супраць адкладання гэтага пытання. Ён заявіў, што без беларускай мовы не будзе і самой Беларусі, і заклікаў беларускую эліту дыяспару больш актыўна карыстацца роднай мовай. Сярод магчымых крокаў ён прапанаваў стварыць сапраўдны беларускі нацыянальны ўніверсітэт за мяжой, напрыклад у Беластоку.

**Арцём Брухан** прывёў у прыклад Венесуэлу і досвед гэтай краіны, паказаўшы, як створаныя дэмакратычнымі сіламі інстытуты могуць стаць паўнавартаснымі суб’ектамі перамоў у момант адкрыцця вакна магчымасцяў. Ён падтрымаў ідэю нацыянальнага дыялогу і адзначыў, што яго асновай павінна стаць незалежнасць Беларусі, якую, паводле ягоных слоў, падтрымліваюць 95–97% грамадзян.



Панэль 2

# Праз мір ва Украіне — да свабоды ў Беларусі

## *Праблемы. Сцэнарыі. Супрацоўніцтва*

Травеньскі візіт Святланы Ціханоўскай у Кіеў адкрывае новыя магчымасці для беларуска-украінскага супрацоўніцтва. Чым мы можам дапамагчы адно аднаму? Якія супольныя крокі могуць быць зробленыя ў найбліжэйшы час і што ўжо робіцца? Якія мусяць быць прыярытэты ў стратэгічным супрацоўніцтве?

**Мадэратар: Яўген Магда,** *украінскі палітолаг, дырэктар Інстытута сусветнай палітыкі*

**Спікеры(-кі):**

**Франак Вячорка,** *галоўны дарадца Святланы Ціханоўскай*

**Ярaслаў Чарнагор,** *пасол па асаблівых даручэннях (МЗС Украіны)*

**Анатоль Міхнавец,** *віцэ-спікер Каардынацыйнай Рады*

**Вадзім Галайчук,** *сустаршыня Міжфракцыйнага аб’яднання дэпутатаў «За дэмакратычную Беларусь» Вярхоўнай рады Украіны*

**Святлана Шаціліна,** *кіраўніца Місіі дэмакратычных сілаў Беларусі ў Кіеве*

**Вадзім Кабанчук,** *прадстаўнік па нацыянальнай бяспецы і абароне Аб’яднанага Пераходнага Кабінета*

---

На пачатку дыскусіі мадэратар звярнуўся да ўдзельнікаў з просьбай акрэсліць цяперашні стан і перспектывы беларуска-украінскіх дачыненняў.

**Франак Вячорка** адзначыў, што ўкраінскі кірунак з’яўляецца безумоўным прыярытэтам для беларускіх дэмакратычных сіл, бо менавіта ад поспеху Украіны залежыць адкрыццё «вакна магчымасцей» для Беларусі. Травеньскі візіт Святланы Ціханоўскай у Кіеў адкрыў новыя дзверы і засведчыў гатоўнасць украінскага кіраўніцтва да супрацоўніцтва. Сярод ужо дасягнутых вынікаў ён адзначыў ультыматум прэзідэнта Зяленскага, які прымусіў Лукашэнку змяніць рыторыку, наладжаны абмен інфармацыяй па санкцыях праз Belpol і супольную працу па прыцягненні Лукашэнкі да адказнасці ў Міжнародным крымінальным судзе, дзе Украіна магла б далучыцца да заявы Літвы. Таксама ён згадаў магчымасць пашырэння працы ў Савеце нацыянальных меншасцей для ўмацавання голасу беларускай супольнасці, прапанаваў ператварыць Люблінскі трыкутнік у «чатырохкутнік» і развіваць сувязі на ўзроўні грамадскага сектара. Пры гэтым ён назваў галоўнай практычнай праблемай для беларусаў ва Украіне пратэрмінаваныя пашпарты, што закранае ад 100 да 3000 чалавек і стварае пастаянны страх дэпартацыі.

**Ярaслаў Чарнагор** пацвердзіў, што ягонае прызначэнне паслом па асаблівых даручэннях ініцыявала МЗС Украіны і узгадніў прэзідэнт Зяленскі менавіта для пабудовы афіцыйных каналаў камунікацыі з беларускімі дэмакратычнымі сіламі. Адным з першых істотных вынікаў гэтай працы стаў візіт Ціханоўскай. Паводле Чарнагора, на знешнепалітычным трэку паміж МЗС

Украіны і беларускімі дэмакратычнымі структурамі забяспечана поўнае разуменне і ўзаемная падтрымка.

**Анатоль Міхнавец** заявіў, што мір настане толькі пасля перамогі Украіны, і гэта з'яўляецца адзіным рэальным «вакном магчымасцей» для беларусаў. Ён заклікаў да стварэння магутнага незалежнага беларускага вайсковага падраздзялення ва Украіне ды ўмацавання сектара бяспекі.

**Вадзім Галайчук** звярнуў увагу на тое, што ўкраінскае грамадства цяпер падзеленае: адна палова лічыць беларусаў ворагамі-суагрэсарамі, а іншая — жыхарамі акупаванай тэрыторыі. Гэта адлюстроўваецца і ў Вярхоўнай радзе, дзе зарэгістраваныя два супрацьлеглыя праекты пастаноў аб статусе Беларусі. Задача дэмакратычных сіл і Украіны — напоўніць супрацоўніцтва канкрэтнымі справамі, каб змяніць грамадскую думку ўкраінцаў у пазітыўны бок. Галайчук падкрэсліў, што ў міжфракцыйным аб'яднанні «За дэмакратычную Беларусь» прадстаўлены кіраўнікі ўсіх дэлегацый Рады ў міжнародных арганізацыях, такіх як АБСЕ, ПАЕ і ПА НАТО. Для эфектыўнасці гэтай працы патрэбныя выразна сфармуляваныя запыты ад беларускіх дэмсіл.

**Святлана Шаціліна** адзначыла, што беларускія дэмакратычныя сілы дагэтуль не выступаюць перад украінскімі ўладамі «адзіным голасам», а застаюцца фрагментаванымі. Яна падкрэсліла, што беларусы недапрацоўваюць у аргументацыі свайго патэнцыялу для Украіны. Разам з тым яна звярнула ўвагу, што ўмовы для беларускіх добраахвотнікаў такія ж, як і для іншых замежнікаў, хоць іх матывацыя прынцыпова адрозніваецца, што абмяжоўвае іх колькасць.

**Вадзім Кабанчук** адзначыў пазітыўныя трэнды ў двухбаковых дачыненнях, але паказаў на трывожную тэндэнцыю: пакуль на боку Украіны ваюе Полк Каліноўскага, на боку Расіі ваююць некалькі тысяч беларусаў, у асноўным найміты з усходніх рэгіёнаў краіны, завабленыя вялікімі грашовымі выплатамі. Больш за 500 з іх ужо загінулі, некалькі дзесяткаў знаходзяцца ў палоне. Кабанчук заклікаў даносіць да грамадзян Беларусі інфармацыю пра каласальную смяротнасць у расійскіх штурмавых частках.

**Яўген Магда** звярнуў увагу, што ва Украіне больш за 25 000 грамадзян падпісалі петыцыю аб змене заканадаўства, каб званне Героя Украіны маглі атрымліваць замежнікі. Актыўны ўдзел у гэтым бралі беларускія актывісты, зацікаўленыя ва ўшанаванні памяці беларускіх добраахвотнікаў, якія аддалі жыццё за свабоду Украіны і Беларусі.

**Крысціна Шыянок** з Офіса дэмакратычных сіл Беларусі ў Чэскай Рэспубліцы пацікавілася ў ўкраінскіх гасцей магчымасцю стварэння мемарыялу ці алеі для загінулых беларускіх ваяроў на Лук'янаўскіх могілках, дзе пахавана Марыя Зайцава. Яраслаў Чарнагор адказаў, што пытанне ўшанавання памяці герояў актуальнае для ўсяго ўкраінскага грамадства і зараз працуюць Нацыянальныя мемарыяльныя вайсковыя могілкі. Справа стварэння асобных алей ці афармлення магіл патрабуе супольных намаганняў, і ўкраінскі бок не чыніць гэтаму ніякага супраціву.

Былы добраахвотнік **Аляксандр Клачко** і актывіст **Ігар Ціханюк** паставілі пытанне пра разблакіроўку рахункаў, выкананне выплат сем'ям загінулых беларускіх ваінаў і статус Беларусі. **Яраслаў Чарнагор** заклікаў з разуменнем паставіцца да рэалій ваеннага часу, бо ўся дзяржаўная машына Украіны працуе ў рэжыме выжывання і адбіцця штодзённых паветраных удараў РФ, таму шмат якія цывільныя і юрыдычныя пытанні адкладаюцца. **Святлана Шаціліна** патлумачыла, што банкі вымушаны дзейнічаць у межах існых абмежаванняў, і для рашэння патрэбна альбо палітычная воля для змены закону, альбо кропкавыя юрыдычныя крокі. Вадзім Галайчук акрэсліў галоўную складанасць з выплатамі сем'ям загінулых: Украіна не можа пераводзіць значныя валютныя сродкі сваякам, якія жывуць у Беларусі ці РФ, бо гэтыя грошы папоўняць эканоміку ворага ці будуць канфіскаваныя рэжымам. Што да статусу Беларусі, то прызнанне яе «акупаванай» можа даць Лукашэнку алібі, таму Украіна чакае рашэнняў Міжнароднага трыбуналу.

**Дзяніс Герасімчык** з руху «Каліноўцы» і фракцыі «Воля» ў КР крытычна заявіў, што дапамога

добраахвотнікам і беларусам ва Украіне знаходзяцца ў Офіса Ціханоўскай на заднім плане, а таму на гэтым кірунку няма практычных вынікаў працы. **Франак Вячорка** выказаў нязгоду з такой ацэнкай і заявіў, што добраахвотнікі заўсёды былі на першым плане і менавіта яны змянілі стаўленне ўкраінцаў да беларусаў. Ён нагадаў пра супольную працу з Галайчуком па прыняцці закона аб добраахвотніках, запуск петыцыі аб званні Героя Украіны і паспяховую разблакіроўку рахункаў для беларусаў з легальным статусам ва Украіне, адзначыўшы, што праблемы са рахункамі застаюцца ў асноўным у тых, хто з'ехаў у ЕС і не прайшоў унутраную верыфікацыю.






Дэбаты

# ТЭМА І. «Пакараць нельга прабачыць. Дзе паставіць коску?»

А: Без люстрацыі, праверкі і забароны на прафесію для ўсіх удзельнікаў рэпрэсіяў мы проста запраграмуем вяртанне да аўтарытарызму. Сістэма гвалту адновіцца, а ахвяры будуць здраджаныя. Справядлівасць і пакаранне злачынцаў — гэта адзіны падмурак, на якім можна пабудаваць давер да новых інстытутаў.

Б: Калі звольніць ці пасадзіць чыноўнікаў, сілавікоў і настаўнікаў, краіна проста спыніцца: не будзе каму кіраваць гарадамі, вучыць дзяцей і трымаць інфраструктуру. Нам патрэбен свой «пакт забыцця» і нацыянальнае прымірэнне, каб пазбегнуць новага расколу і забяспечыць спакойны транзіт улады.

**Мадэратарка: Ксенія Луцкіна,** *журналістка, сябра Каардынацыйнай Рады 1 склікання, былая палітзняволеная*

**Апаненты:**

**Мікалай Дзядок,** *грамадска-палітычны дзеяч, блогер, пісьменнік, двойчы былы палітзняволены*

**Роза Турарбекава,** *доктар навук, эксперт па міжнародных адносінах*

---

**Мікалай Дзядок** выступіў за люстрацыю, праверку і абмежаванне доступу да дзяржаўнай службы для людзей, якія ўдзельнічалі ў рэпрэсіях. На яго думку, без гэтага існуе рызыка аднаўлення аўтарытарнай сістэмы. Пры гэтым ён прызнаў, што праз маштаб рэпрэсій прымяняць аднолькавы падыход да ўсіх немагчыма, таму люстрацыю неабходна праводзіць дыферэнцыравана і паэтапна. У якасці дрэннага прыкладу ён прывёў Нікарагуа, дзе пасля змены ўлады ў 1990-х гадах адмовіліся ад люстрацыі. Паводле Дзядка, гэта ў выніку дазволіла Даніэлю Артэзе вярнуцца да ўлады ў 2006 годзе і прывяло да новай хвалі гвалту ў 2018 годзе.

**Роза Турарбекава** запярэчыла, што жорсткае люстрацыйнае заканадаўства можа прывесці да сабатажу з боку дзяржаўнага апарату, росту сацыяльнай напружанасці і яшчэ большага расколу грамадства. Яна прапанавала разглядзець мадэль нацыянальнага прымірэння або часовага «забыцця» — у прыватнасці, на прыкладзе іспанскага «пакта забыцця». Паводле Турарбекавай, пры пераходзе ўлады Беларусь можа сутыкнуцца з вострым дэфіцытам кадраў у арміі, міліцыі, сістэме адукацыі і ахове здароўя. Таму неабходна ацэньваць ступень удзелу кожнага чалавека ў рэпрэсіях і яго асабістую адказнасць, а не прымяняць аднолькавыя меры да ўсіх. Турарбекава адзначыла, што жорсткія чысткі дзяржаўнага апарату могуць мець непрадказальныя наступствы. У якасці прыкладу яна прывяла Ірак, дзе татальная дэбаасізацыя пазбавіла працы былых вайскоўцаў і дзяржаўных служачых, частка якіх пасля далучылася да «Ісламскай дзяржавы». Паводле яе, ва ўмовах знешняй пагрозы асабліва важна захаваць адзінства грамадства і знайсці спосаб інтэграваць частку дзяржаўнага апарату ў новую сістэму.

Дзядок заявіў, што **паспяховы дэмакратычны транзіт немагчымы без справядлівасці**. Ён звярнуў увагу на тое, як палітыка «забыцця» будзе ўспрымацца людзьмі, якія перажылі катаванні, страцілі блізкіх, працу або бізнес, калі пасля змены ўлады ўбачаць сваіх

пераследнікаў на волі і на ранейшых пасадах. Турарбекава прызнала, што гэта складаны маральны выбар, але адзначыла: грамадства можа часова прыняць такі кампраміс дзеля захавання краіны, калі аўтарытэтныя людзі, якія самі прайшлі праз рэпрэсіі, змогуць растлумачыць неабходнасць такога рашэння.

Дзядок не пагадзіўся з гэтым аргументам. Паводле яго, у беларускім грамадстве існуе вялікі запыт на справядлівасць. Калі яго праігнараваць, людзі могуць расчаравацца ў дэмакратыі і вяршэнстве права, што створыць глебу для прыходу да ўлады новага папуліста. У якасці прыкладу ён прывёў Беларусь 1994 года. Турарбекава не пагадзілася з такой інтэрпрэтацыяй падзей 1994 года. Яна адзначыла, што прычыны перамогі Лукашэнкі былі больш складанымі, а само разуменне вяршэнства права ў постсацыялістычным грамадстве таго часу заставалася недастаткова сфармаваным.

У сувязі з расійскай пагрозай Турарбекава закранула пытанне аб тым, што з'яўляецца больш важным — правядзенне дэсаветызацыі ці захаванне адзінства нацыі. Дзядок адказаў, што без дэсаветызацыі сапраўднае адзінства немагчымае, паколькі значная частка прадстаўнікоў сілавых структур сёння захоўвае прыхільнасць да ідэалогіі «русского мира». Турарбекава не пагадзілася з такой ацэнкай і назвала абагульненне адносна ўсіх сілавікоў празмерным спрашчэннем, якое не адлюстроўвае рэальнай карціны.

З залы задалі пытанне, у якой краіне люстрацыя прайшла найбольш паспяхова. Роза Турарбекава назвала Чэхію. Мікалай Дзядок у якасці прыкладаў прывёў Перу, часткова Паўднёвую Афрыку, а таксама Літву, Латвію і Эстонію.

***Па выніках галасавання перамог Мікола Дзядок і ідэя шырокай люстрацыі.***

---

Дэбаты

# ТЭМА II. «Уцёкі з «загончыка беларушчыны» vs «Беларусь перадусім»

А: Гвалтоўнае ці нават лагоднае пашырэнне беларускай мовы на ўсе сферы — гэта спроба ісці наперад з галавой, павернутай назад. У XXI стагоддзі выжываюць тыя, хто стварае прадукты глабальнага ўзроўню і канкурыруе на сусветным рынку. Абсалютна не важна, на якой мове напісаны код беларускага стартапа, створана навуковае адкрыццё ці вядзецца бізнес — на англійскай, рускай ці беларускай. Галоўнае — эфектыўнасць і вынік. Зацыкленасць на мове замыкае нас у лакальнай прасторы, у той час як нам трэба інтэгравацца ў сусветную эканоміку.

Б: Глабалізм без нацыянальнага падмурка — гэта шлях да поўнай асіміляцыі і растварэння ў «рускім свеце». Калі для нас мова і культура не важныя, то чаму мы наогул называемся беларусамі, а не проста жыхарамі нейкай тэрыторыі? Без сваёй ідэнтычнасці мы будзем вечна прайграваць інфармацыйную і культурную вайну Расіі. Дзяржава, якая не бароніць і не развівае сваю мову, не мае будучыні. Глабальны прадукт можа стварыць і беларус, але калі ён робіць гэта без сувязі са сваёй культурай, яго патэнцыял працуе на іншыя краіны, а не на Новую Беларусь.

**Мадэратарка: Ксенія Луцкіна,** *журналістка, сябра Каардынацыйнай Рады 1 склікання, былая палітзняволеная*

**Апаненты:**

**Аляксандр Фядута,**
*грамадскі дзеяч, літаратуразнаўца, доктар гуманітарных навук, былы палітзняволены*

**Кацярына Ваданосава,**
*папулярызатарка гісторыі Беларусі, музыка, тэлевядучая*

**Кацярына Ваданосава** абараняла важнасць беларускай мовы, культуры і гісторыі як асновы нацыянальнай ідэнтычнасці. Яна падкрэсліла, што беларусы — не «статак», а народ з унікальнай культурнай спадчынай. Паводле яе, захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці не супярэчыць адкрытасці свету: Беларусь можа быць часткай міжнароднай супольнасці, захоўваючы пры гэтым сваю адметнасць. Асобна Ваданосава адзначыла небяспеку культурнай асіміляцыі ва ўмовах суседства з Расіяй, якая дзейнічае паводле імперскай логікі «адна мова — адзін народ». На яе думку, далейшая страта пазіцый беларускай мовы можа стаць пагрозай і для незалежнасці краіны.

**Аляксандр Фядута** адзначыў, што беларуская культура не знаходзіцца ў нейкім «загончыку». Ён дадаў, што беларусы ў эміграцыі натуральна карыстаюцца мовамі краін пражывання — напрыклад, польскай у Варшаве. На яго думку, беларусам важна не замыкацца ўнутры ўласнай культуры, а ўмець прадстаўляць яе свету і адначасова быць адкрытымі да іншых культур. Фядута прывёў у прыклад людзей, якія папулярызуюць беларускую культуру за мяжой, у тым ліку Андрэя Хадановіча. На яго думку, менавіта такая праца дазваляе беларускай культуры быць заўважнай у міжнародным кантэксце.

Ваданосава пагадзілася, што ў эміграцыі беларусам даводзіцца прымаць правілы краіны пражывання. Аднак яна падкрэсліла, што беларуская мова застаецца для яе асновай асабістай ідэнтычнасці: яшчэ ў 2006 годзе яна цалкам перайшла на беларускую мову ў сям'і і ў мысленні. Яна таксама паставіла пытанне: **як абараніць Беларусь ад культурнага ўплыву Расіі, калі беларуская мова працягне страчваць свае пазіцыі ўнутры краіны?**

Фядута прызнаў, што праблема існуе, але прапанаваў пачаць з практычных крокаў. Паводле яго, пасля пераходу ўлады да дэмакратычнага ўрада першай задачай павінна стаць забеспячэнне выканання ўжо дзейнага закона аб дзвюх дзяржаўных мовах. Калі гэтага ўдасца дасягнуць, праз пяць гадоў можна будзе вярнуцца да пытання пра моўную палітыку і правядзення адпаведных рэферэндумаў.

У адказ на пытанне **Тараса Тарналіцкага** пра падтрымку рускамоўнай беларускай культуры ў эміграцыі Ваданосава адзначыла, што гэта асабісты выбар кожнага, хоць і асабіста ў эміграцыі не набыла ніводнай рускамоўнай кнігі. Фядута не пагадзіўся з такім падыходам і адзначыў, што ацэньваць твор трэба перадусім паводле яго грамадскай значнасці. У якасці прыкладу ён прывёў **Святлану Алексіевіч**. Сам Фядута таксама плануе напісаць кнігу пра свой турэмны досвед у ІК-15 па-руску, паколькі, паводле яго, так яе зможа прачытаць больш шырокае кола людзей.

***З невялікай перавагай па выніках галасавання перамог Аляксандр Фядута.***

# ТЭМА III. «Нейтралітэт гарантуе бяспеку Беларусі: за ці супраць?»

А: Доўгі час многія беларусы паводле апытанняў схіляліся да статуса нейтральнай або пазаблокавай краіны як найлепшай гарантыі няўцягвання ў рэгіянальныя або глабальныя ваенныя канфлікты ды геапалітычныя супрацьстаянні. Мадэль Швейцарыі або варыянт «фінляндызацыі» як страты геапалітычнага манеўра, але захавання эканамічнай незалежнасці і суверэнітэту прапануюцца як выйсце побач з агрэсіўным і амбітным суседам.

Б: Ранейшыя фарматы нейтралітэту не працуюць у сучасным свеце, нават тыя краіны, што раней мелі пазаблокавы статус, цяпер яго імкліва пазбаўляюцца. Мы трапілі ў час новых глабальных супрацьстаянняў і Беларусь можа атрымаць бяспеку толькі ў складзе таго ці іншага ваенна-палітычнага блока. Ці гэта мусіць быць блок NATO або нейкая іншая рэгіянальная формула бяспекі, вызначаецца выключна мэтазгоднасцю і ўмовамі ўваходжання.

**Мадэратарка: Ксенія Луцкіна,** *журналістка, сябра Каардынацыйнай Рады 1 склікання, былая палітзняволеная*

**Апаненты:**

**Андрэй Казакевіч,**
*доктар палітычных навук, дырэктар Інстытута палітычных даследаванняў «Палітычная сфера»*

**Зміцер Міцкевіч,**
*журналіст «Белсат», аналітык у сферы нацыянальнай бяспекі і абароны*

**Андрэй Казакевіч** выступіў у падтрымку нейтралітэту. Паводле яго, гэтая ідэя можа стаць асновай для нацыянальнага кансэнсусу, бо яна традыцыйна мае падтрымку беларускага грамадства. Беларусі неабходна выйсці з-пад уплыву Расіі, аднак дамовіцца аб нейтральным статусе з суседзямі, на яго думку, прасцей, чым уступіць у ваенны альянс. Нейтралітэт таксама дазваляе малой краіне захаваць большую стратэгічную аўтаномію.

**Зміцер Міцкевіч** назваў нейтралітэт гістарычна няўдалай стратэгіяй. На яго думку, фармальны нейтралітэт Беларусі ў 1990-я не забяспечыў бяспеку: Расія ўмацавала рэжым Лукашэнкі, а Беларусь у выніку стала ўдзельніцай вайны супраць Украіны. З улікам геаграфіі Расія можа разглядаць нейтралітэт Беларусі як магчымасць для кантролю над краінай, таму сцэнар «фінляндызацыі» ён лічыць нерэалістычным. Акрамя таго, узброены нейтралітэт у супрацьстаянні з Расіяй, паводле яго, будзе эканамічна непасільным.

**Казакевіч** у адказ адзначыў, што рэальнага нейтралітэту ў Беларусі ў 1990-я не было: краіна хутка далучылася да АДКБ і Саюзнай дзяржавы. Ён паставіў пытанне, колькі будуць каштаваць абарона і гарантыі бяспекі пры нейтральным статусе. **Міцкевіч** пагадзіўся, што нейтральныя краіны нясуць значныя выдаткі на абарону, але падкрэсліў, што Беларусь і сёння выдаткоўвае на яе мала — у тым ліку дзякуючы льготным пастаўкам з Расіі.

**Казакевіч** таксама адзначыў, што нейтралітэт не азначае адмову ад абаронных партнёрстваў

і дазваляе гнутка выбудоўваць адносіны з рознымі бакамі. Пры гэтым уступленне ў NATO, на яго думку, таксама запатрабуе значных выдаткаў на пераўзбраенне за ўласны кошт. **Міцкевіч** не пагадзіўся: інтэграцыя ў NATO і еўрапейскую сістэму абароны, паводле яго, можа не толькі ўзмацніць бяспеку, але і даць беларускім прадпрыемствам доступ да еўрапейскага рынку ўзбраенняў, новыя інвестыцыі і замовы. **Казакевіч** у адказ адзначыў, што нейтральны статус сам па сабе не перашкаджае экспарту ўзбраенняў, прывёўшы ў прыклад Швейцарыю.

На пытанне, **ці можа нейтралітэт быць часовым рашэннем перад далучэннем да ваеннага блока, Міцкевіч** адказаў, што Беларусь ужо цяпер павінна дэклараваць еўраатлантычныя памкненні. Казакевіч адзначыў, што беларускае грамадства пакуль не гатовае да ўступлення ў ваенныя саюзы і хутчэй імкнецца пазбягаць такога выбару.

На пытанне, што павінна быць першасным — аднаўленне суверэнітэту або вызначэнне статусу нейтралітэту, **Казакевіч** адказаў, што гэтыя пытанні звязаныя: нейтралітэт можа стаць адной з формаў замацавання дзяржаўнай аўтаноміі. **Міцкевіч** пагадзіўся, што суверэнітэт — ключавая задача, але дадаў, што дэмакратычныя сілы ўжо цяпер павінны дэманстраваць гатоўнасць удзельнічаць у забеспячэнні еўрапейскай бяспекі.

**Аляксандра Мамаева** з Каардынацыйнай Рады запытала, якія альянсы маглі б рэальна абараніць Беларусь пры захаванні расійскай пагрозы і выбары нейтралітэту. **Казакевіч** прывёў у прыклад Швейцарыю і Фінляндыю і заявіў, што Беларусі варта інтэгравацца ў агульнаеўрапейскую сістэму бяспекі, захоўваючы магчымасць атрымліваць гарантыі з розных бакоў. **Міцкевіч** падкрэсліў, што асноўная пагроза зыходзіць з Расіі, таму рэальную бяспеку можа забяспечыць паўнавартасны саюз з суседнімі краінамі — Польшчай, Украінай і краінамі Балтыі.

***У выніку галасавання перавагу атрымала блокавая пазіцыя — інтэграцыя Беларусі ў сістэму ваенна-палітычных альянсаў, якую абараняў Зміцер Міцкевіч.***



Панэль 3

# «Постлукашэнкаўская» Беларусь»

## *Рэформы. Перспектывы. Візіі*

Змены ў Беларусі — пытанне часу. Усе дыктатуры падаюць. Пытанне: што пасля? Якім можа быць дэмакратычны транзіт? Якія рэформы трэба правесці і ці мае сэнс іх рыхтаваць ужо сёння? Ці магчыма вывесці Беларусь з татальнай залежнасці ад Расіі? Што Еўрасаюз можа прапанаваць Беларусі, а Беларусь — Еўрасаюзу? Мы мусім думаць не толькі пра тое, ад чаго мы хочам сысці, але і пра тое, да чаго мы прапануем рухацца.

**Мадэратар: Аляксандр Кныровіч,** *прадпрымальнік, блогер, тэлевядучы*

**Спікеры(-кі):**

**Дзмітрый Крук,**
*даследчык, BEROC*

**Леў Львоўскі,**
*акадэмічны дырэктар BEROC*

**Аліса Рыжычэнка,**
*прадстаўніца па эканоміцы і фінансах Аб’яднанага Пераходнага Кабінета*

**Анатоль Лябедзька,**
*дырэктар Цэнтра «Еўрапейскі дыялог», дарадца Святланы Ціханоўскай па канстытуцыйнай рэформе і парламенцкім супрацоўніцтве*

**Юлія Міцкевіч,**
*гендарная экспертка, прадстаўніцтва па сацыяльнай палітыцы Аб’яднанага Пераходнага Кабінета*

**Юрый Губарэвіч,**
*старшыня Руху «За Свабоду», каардынатар кампаніі «Кадравы рэзерв»*

---

Мадэратар дыскусіі **Аляксандр Кныровіч** адкрыў панэль і адзначыў шматгадовую стагнацыю беларускай эканомікі: за апошнія 13 гадоў яе агульны рост склаў усяго каля 12% (у сярэднім менш за 1% на год). Кныровіч заявіў, што ў цяперашняй дзяржаўнай сістэме няма запыту на рэформы, таму дэмакратычная супольнасць мусіць планаваць транзіт і будучыя змены ўжо зараз.

**Аліса Рыжычэнка** адзначыла падзенне Беларусі ў Глобальным інавацыйным індэксе з 62-га на 85-е месца і патлумачыла, што праблема палягае не ў чалавечым патэнцыяле, а ў сістэме: па вяршынстве права Беларусь займае 133-е месца, а па інстытуцыйным асяроддзі для інавацый — 137-е. Яна дадала, што на навуку выдаткуецца ўсяго каля 0,5% ВУП, настаўнікі зарабляюць у 3–4 разы менш, чым у Польшчы, а доля высокатэхналагічнага экспарту складае ўсяго 4% ВУП. Экспертка заўважыла, што простае ўліванне грошай у навуку не спрацуе, таму патрэбныя рынкавыя механізмы, абарона прыватнай уласнасці і падаткавыя ільготы.

**Дзмітрый Крук** пагадзіўся з неабходнасцю рэформ і дадаў, што адзіны шлях для выжывання незалежнай Беларусі – еўраінтэграцыя. Ён згадаў даследаванне BEROC, паводле якога цаной пераарыентацыі з Расіі на ЕС стане падзенне ВУП на 6,5% за 2,5 года і запатрабуецца стабілізацыйны фонд у 10–16 млрд долараў. Тым не менш, рэформы — гэта інвестыцыі ў будучыню, выдаткі на якія грамадства мусіць быць гатовае ўзяць на сябе, нават калі спадзяецца на падтрымку звонку. Ён таксама прапанаваў праграму «Belarus Democratic Transition Facility» ў межах афіцыйных механізмаў ЕС па прыкладзе рэгламенту 2000 года для

краін былай Югаславіі.

**Леў Львоўскі** дапоўніў эканамічны аналіз падлікамі, што пенсійная рэформа можа каштаваць краіне 40 млрд долараў і больш. Ён прывёў лічбы: пенсіянеры зараз складаюць 26% насельніцтва, а нараджальнасць упала з 1,7 дзіцяці на жанчыну ў 2016 да 1,03 у 2025 годзе. Эксперт папярэдзіў, што да канца стагоддзя насельніцтва Беларусі можа скараціцца да 3 мільёнаў чалавек, а выдаткі на пенсіі паглынуць чвэрць ВУП. Ён таксама згадаў гендарны перакос, дзе мужчыны жывуць у сярэднім на 10 гадоў менш за жанчын. Львоўскі дадаў, што спатрэбіцца павышэнне пенсійнага ўзросту, назапашвальныя рахункі, прыцягненне мігрантаў і доўгатэрміновы крэдыт пад супастаўны з тэмпап росту ВУП працэнт.

**Анатоль Лябедзька** не пагадзіўся з меркаваннем, нібыта распрацоўшчыкі Канстытуцыі Новай Беларусі дзейнічалі без уліку меркавання народа, і нагадаў, што яны за адзін год атрымалі 3 000 канкрэтных прапаноў ад грамадзян, а на платформе «Голас» у галасаванні ўзялі ўдзел амаль 500 тысяч чалавек. Ён дадаў, што абяцаны ЕС пакет дапамогі ў 3 млрд еўра — гэта заніжаная сума, і наяўнасць выразных праектаў дапаможа пераканаць Еўракамісію павялічыць фінансавую дапамогу да 10 млрд долараў.

**Юлія Міцкевіч** не пагадзілася са сцвярджэннем пра незацікаўленасць грамадства гендарнай тэматыкай і патлумачыла, што даследаванні фіксуюць высокую важнасць праблем хатняга гвалту і няроўнасці ў заробках для грамадства. Яна дадала, што наступствы хатняга гвалту наносяць эканамічную шкоду краіне, і падкрэсліла патрэбу ў комплексным антыдыскрымінацыйным заканадаўстве з рэальным бюджэтным фінансаваннем.

**Юрый Губарэвіч** адказаў на меркаванні, што трэба цалкам замяняць увесь дзяржапарат з 37 тысяч (на ключавых пасадах) да 180 тысяч чалавек. Ён сказаў, што каля 700 падрыхтаваных удзельнікаў «Кадравага рэзерву» — гэта матываваныя лідары, якія здольныя накіраваць рэформы на месцах і змяніць сам прынцып дзяржслужбы без масавых звальненняў.

**Размова перайшла да бачання першых дзеянняў палітыкаў пасля транзіту ўлады.**

- **Анатоль Лябедзька** прапанаваў у першыя 3–4 месяцы правесці інфармацыйную кампанію ў падтрымку рэформ, пасля чаго адначасова рэферэндум і прэзідэнцкія выбары (каб новы прэзідэнт адразу пачаў працаваць ва ўрэзаных канстытуцыйных паўнамоцтвах), далей – выбары парламента па новым выбарчым кодэксе. Паводле Лябедзькі, парламенцкая форма кіравання і падзел уладаў стануць гарантыяй непавяртання дыктатуры.

- **Леў Львоўскі** назваў наступныя меры пасля транзіту ўлады: запуск пранатальнай палітыкі, перадача міграцыйных пытанняў Міністэрству працы, праца з дыяспарай і скарачэнне 10-гадовага разрыву ў працягласці жыцця мужчын і жанчын.

- **Юрый Губарэвіч** падкрэсліў важнасць захавання кіравальнасці дзяржавы, запуску мясцовага самакіравання, правядзення аўдыту і праграмы перападрыхтоўкі для дзеючых чыноўнікаў.

- **Юлія Міцкевіч** дапоўніла крокі ратыфікацыяй Стамбульскай канвенцыі, Канвенцыі МАТ № 190, Рэзалюцыі ААН 1325, выкананнем рэкамендацый CEDAW і прыняццём нацыянальнага плана па гендарнай роўнасці. Актыўнае залучэнне жанчын у працэсы прыняцця рашэнняў і барацьба з гвалтам, паводле Міцкевіч, павінна перадухіліць вяртанне дыктатуры.

- **Дзмітрый Крук** прапанаваў афіцыйна паведаміць Расіі пра выхад Беларусі з Саюзнай дзяржавы і ЕАЭС ды пачаць распрацоўку Пагаднення аб асацыяцыі з ЕС. Пры гэтым на момант гэтых крокаў пажадана, каб набыла моц «Belarus Democratic Transition Facility».

- **Аліса Рыжычэнка** дадала заклік да прыняцця законаў аб абароне прыватнай уласнасці і поўнай лічбавізацыі дзяржсектара ды дзяржзакупак, што зэканоміць бюджэту 700–800 млн долараў у год на карысць навукі і адукацыі.

У завяршэнне Аляксандр Кныровіч падкрэсліў, што за рамкамі абмеркавання засталіся найважнейшыя рэформы адукацыі, медыцыны, арміі, міліцыі і зямельных адносін. Ён заклікаў дэмакратычныя сілы аб’яднаць напрацоўкі ў адзіную комплексную канцэпцыю новай Беларусі, з якой можна адкрыта размаўляць з грамадствам.







**Мадэратарка: Марыя Ландо,** *экспертка па развіцці арганізацыяў грамадзянскай супольнасці*

## Аналітычны даклад: «Параўнальны аналіз нацыянальных дыялогаў у Германіі, Польшчы і Іспаніі як магчымых мадэляў выхаду з палітычнага крызісу ў Беларусі»

**Прэзентаваў: Арцём Брухан,** *намеснік кіраўніка Народнага антыкрызіснага ўпраўлення*

Прэзентацыя

Гэты дакумент, распрацаваны экспертамі Народнага антыкрызіснага ўпраўлення, паўстаў у вельмі складаным палітычным кантэксце. Праз шэсць гадоў пасля падзей 2020 года Беларусь усё яшчэ знаходзіцца ў стане глыбокага сістэмнага палітычнага крызісу, у тым ліку высокай залежнасці ад Расіі.

У даследаванні прапануецца мадэль кіраванага палітычнага транзіту ў Беларусі, якая павінна забяспечыць спыненне рэпрэсій, захаванне незалежнасці і бесперапыннасць дзяржаўнага кіравання. Нацыянальны дыялог разглядаецца як перамоўны працэс паміж прадстаўнікамі дзяржаўнай сістэмы, дэмакратычнымі сіламі і грамадствам для ўзгаднення прававога шляху да свабодных выбараў. Яго перадумовы — суб’ектнасць дэмакратычных сіл, неспрыяльныя для рэжыма знешнія ўмовы, наяўнасць унутры рэжыма прагматычнага крыла, а таксама прававая рамка для бесперапыннасці дзяржкіравання.

Прапанаваная мадэль складаецца з трох этапаў: гуманітарнай дээскалацыі і вызвалення палітзняволеных, тэхнічнай падрыхтоўкі дыялогу і заключэння палітычнага пагаднення. Вынікам мадэлі павінны стаць паспяховы палітычны транзіт.

## «Пазітыўная альтэрнатыва — візія новай Беларусі»

**Прэзентаваў: Анатоль Лябедзька,** *дырэктар Цэнтра «Еўрапейскі дыялог», дарадца Святланы Ціханоўскай па канстытуцыйнай рэформе і парламенцкім супрацоўніцтве*

Праект Цэнтра «Еўрапейскі дыялог» накіраваны на падрыхтоўку канкрэтнай мадэлі Беларусі пасля змены ўлады. Эксперты і эксперткі распрацоўваюць праекты Канстытуцыі і 13 базавых законаў, якія ахопліваюць судовую і выбарчую сістэмы, эканоміку, адукацыю, медыцыну і іншыя сферы. Гэтыя напрацоўкі павінны даць звычайным беларусам(-кам) і дзяржаўным служачым разуменне таго, як можа працаваць новая сістэма. Пазітыўная альтэрнатыва — таксама важная частка шляху да еўраінтэграцыі.

У праекце ўжо паўдзельнічалі сотні беларускіх і міжнародных экспертаў. Распрацоўкі таксама выкарыстоўваюцца для працы з міжнароднымі партнёрамі і могуць стаць асновай будучых рэформ. Матэрыялы адкрытыя для ананімнага каментавання і абмеркавання на платформе «Прастора», а таксама даступныя на сайце Святланы Ціханоўскай і платформе «Тры Сланы».

## Праект «Раёнка»

**Прэзентаваў: Станіслаў Салавей,** *намеснік прадстаўніцы па сацыяльнай палітыцы АПК*

Прэзентацыя

«Раёнка» — анлайн-платформа, якая дапамагае жыхарам і жыхаркам беларускіх рэгіёнаў атрымліваць медыцынскія кансультацыі ў беларускіх дактароў, якія жывуць за мяжой. Праект вырашае праблему нястачы дастаткова кваліфікаваных дактароў за межамі вялікіх гарадоў. Ён арыентаваны перадусім на рэгіёны і ўразлівыя групы, у тым ліку шматдзетныя сем'і, былых палітзняволеных, людзей з інваліднасцю і тых, хто сутыкнуўся з гвалтам.

Кансультацыі праводзяцца бяспечна — без неабходнасці паказваць твар, з ананімнай верыфікацыяй і магчымасцю перадаваць медыцынскія дакументы анлайн. Для беларусаў унутры краіны яны будуць бясплатнымі, а выдаткі будзе пакрываць дыяспара. Сабекошт адной кансультацыі каля 30 еўра. Запуск платформы запланаваны на верасень 2026 года.

## Платформа «Тры Сланы»

**Прэзентаваў: Данііл Гаркавы,** *платформа «Тры Сланы» / праект Новая Беларусь*

Прэзентацыя

«Тры Сланы» — каардынацыйная платформа і інструмент лічбавай дэмакратыі для беларускіх арганізацый. Яна ўжо выкарыстоўвалася для выбараў у Каардынацыйную Раду, а новая версія павінна аўтаматызаваць збор і распаўсюд кантэнту арганізацый, каб ім не даводзілася асобна падтрымліваць яшчэ адну пляцоўку.

Абноўленая платформа таксама прапануе інструменты для правядзення мерапрыемстваў, галасаванняў, петыцый і партысіпатыўнага бюджэтавання, а таксама дадасца магчымасць аўтаматычнай падгрузкі кантэнту з сацсетак. Асобная ўвага надаецца бяспецы карыстальнікаў(-ц) у Беларусі: выкарыстоўваюцца аднаразовыя коды і ананімныя імёны. Запуск новай версіі чакаецца ў верасні 2026 года.

## Лічбавыя інструменты Офіса Святланы Ціханоўскай

**Прэзентавала: Маргарыта Ворыхава,** *дарадца Святланы Ціханоўскай па моладзевай палітыцы і студэнцтве*

Прэзентацыя

Ініцыятыва аб'ядноўвае пяць лічбавых праектаў, якія павінны дапамагаць беларусам, падтрымліваць грамадзянскую супольнасць і рыхтаваць інфраструктуру будучай Беларусі. Сярод іх — «Гэта Моладзь» з інфармацыяй пра навучанне і дапамогу студэнтам і моладзі,

«Падарожжа» для ацэнкі магчымасцей і рызык паездак, рэсурсны партал «Крыніца» для абмену рэсурсамі паміж НДА, «Мапа падзей» для беларускіх мерапрыемстваў ва ўсім свеце і «Prastora» для ўдзелу ў распрацоўцы законаў і рэформаў.

Разам гэтыя інструменты ахопліваюць розныя патрэбы — ад адукацыі і бяспекі да ўзаемадапамогі, супольнай дзейнасці і ўдзелу ў стварэнні будучых дзяржаўных інстытутаў. Частка праектаў ужо працуе і мае сталую аўдыторыю, іншыя даюць магчымасць беларусам за мяжой і ўнутры краіны больш актыўна ўзаемадзейнічаць.

## «Роўнасць, інклюзіўнасць, адказнасць: праект гендарных палітык для беларускіх дэмсілаў»

**Прэзентавала: Грацыела Піга,** *кансультантка Рады Еўропы, доктарка навук*

Прэзентацыя

Праект прапануе практычныя рэкамендацыі для больш лепшага з гендарнага пункту гледжання кіравання ў беларускіх дэмакратычных структурах у адпаведнасці з еўрапейскімі стандартамі. Рэкамендацыі падрыхтаваныя на аснове аналізу ўнутраных дакументаў і інтэрв’ю з зацікаўленымі асобамі.

Асноўныя меры датычацца чатырох кірункаў: удасканаленне ўнутраных палітык і абароны ад дыскрымінацыі, збалансаванага прадстаўніцтва жанчын і мужчын, развіцця інклюзіўнай арганізацыйнай культуры і павышэння адказнасці праз збор статыстыкі, маніторынг і справаздачнасць.

## «Наш Грунвальд-2027»

**Прэзентаваў: Юрый Меляшкевіч,** *выканаўца абавязкаў старшыні Партыі БНФ*

Прэзентацыя

Кампанія накіравана на ўзмацненне беларускай прысутнасці ў штогадовым святкаванні перамогі пад Грунвальдам у Польшчы. Яе мэта — аднавіць беларускія гістарычныя сімвалы ў публічнай прасторы, падкрэсліць ролю беларускіх земляў і далучыць беларусаў да фэсту і гістарычных рэканструкцый. Петыцыя ў падтрымку ініцыятывы сабрала больш за 1000 правераных подпісаў.

Пасля таго як у 2026 годзе не ўдалося афіцыйна размясціць бел-чырвона-белы сцяг, каманда прапанавала больш доўгатэрміновае рашэнне — усталяваць на Грунвальдскім полі памятны мастацкі знак у гонар беларускіх ваяроў. Праект разглядаецца як інструмент камунікацыі з польскім грамадствам і спосаб захаваць беларускую традыцыю гістарычных рэканструкцый.

# «Belarus Democracy Tokens»

**Прэзентавала: Аліса Рыжычэнка,** *прадстаўніца па эканоміцы і фінансах Аб’яднанага Пераходнага Кабінета*

Прэзентацыя

Праектам прапануецца стварыць уласную сістэму доўгатэрміновага фінансавання беларускіх дэмакратычных ініцыятыў, каб зменшыць залежнасць ад кароткатэрміновых міжнародных грантаў. Данаты можна рабіць праз розныя плацёжныя сістэмы, а механізм BDT будзе фіксаваць унёсак кожнага донара ў блокчэйне.

Пасля дэмакратычных перамен донары змогуць атрымаць кампенсацыю свайго ўнёску ў адной з формаў — праз падатковыя льготы, працоўны стаж або пенсійныя адлічэнні. Сабраныя сродкі плануецца размяркоўваць паміж інстытутамі дэмакратычнага кіравання, сацыяльнай сферай і адукацыяй, незалежнымі СМІ і культурай і нацыянальнай ідэнтычнасцю. Кожны сектар фармуе сваю раду, якая размяркоўвае сродкі па сваім сектары. Запуск сістэмы плануецца напрыканцы 2026 года.



Панэль 4

# «Беларусь як лабараторыя аўтарытарных рэжымаў»

## *Адказнасць. Праваабарона. Бяспека*

Беларусь стала лабараторыяй сучаснага аўтарытарызму, дзе адпрацоўваюцца механізмы рэпрэсіяў і пераследу іншадумцаў: «экстрэмісцкія» спісы, пашпартны ўказ, справа ЕГУ ці пераслед праз Інтэрпол. Як гарантаваць бяспеку актывістаў унутры краіны і за мяжой? Як палепшыць юрыдычную дапамогу? Як наладзіць супрацоўніцтва з урадамі і міжнароднымі арганізацыямі, каб супрацьдзейнічаць транснацыянальным рэпрэсіям?

**Мадэратар: Фёдар Паўлючэнка,** *галоўны рэдактар незалежнага партала Reform.news*

**Спікеры(-кі):**

**Леанід Марозаў,**
*дарадца Святланы Ціханоўскай па прававых пытаннях*

**Алег Агееў,**
*намеснік старшыні БАЖ*

**Мацвей Купрэйчык,**
*публічны прадстаўнік BELPOL*

**Уладзімір Лабковіч,**
*прадстаўнік Праваабарончага цэнтру «Вясна», былы палітвязень*

**Моніка Станіслава Платэк,**
*чаліня Групы незалежных экспертаў пры ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі*

**Алесь Міхалевіч,**
*доктар навук, грамадскі і палітычны дзеяч*

**Ёана Шыманьска,**
*кіраўніца праграмаў і стратэгіі для Еўропы ў ARTICLE 19*

---

**Уладзімір Лабковіч** адкрыў дыскусію, падзяліўшыся ўласным досведам палітычнага зняволення. Паводле яго, у адрозненне ад папярэдніх хваль рэпрэсій, катаванні пасля 2020 года сталі не асобнымі злоўжываннямі на месцах, а сістэмнай практыкай. Сілавікі, якія здзяйснялі злачынствы ад імя дзяржавы, фактычна застаюцца беспакаранымі.

**Алег Агееў** адзначыў маштаб рэпрэсій супраць незалежных медыя. Ён звярнуў увагу на прызнанне СМІ «экстрэмісцкімі», крымінальныя справы супраць журналістаў і фактычную крыміналізацыю чытання незалежных медыя. Асобна Агееў вылучыў новую масавую практыку — спробы вярбоўкі грамадзян праз пагрозы і схіленне да супрацоўніцтва.

**Мацвей Купрэйчык** заклікаў людзей, якіх спрабуюць завербаваць беларускія спецслужбы, не маўчаць пра такія выпадкі. Ён рэкамендаваў альбо публічна раскрываць спробы вярбоўкі, альбо цалкам ігнараваць супрацоўнікаў КДБ. Паводле яго, важна не дапускаць навязанага рэжымам недаверу паміж людзьмі і не ператвараць грамадства ў асяроддзе ўсеагульных падазрэнняў. **Алесь Міхалевіч** падкрэсліў, што пра спробы вярбоўкі варта неадкладна паведамляць праваабаронцам.

**Купрэйчык** дадаў, што рэпрэсіўная сістэма Беларусі падтрымліваецца Расіяй, якая выкарыстоўвае краіну як своеасаблівую «лабараторыю». Пры гэтым ён адзначыў уразлівасць рэжыму: у свеце магчымай эскалацыі вайны Расіі супраць Украіны сілавікі і вайскоўцы неабавязкова гатовыя ваяваць і паміраць за Лукашэнку. Паводле яго, дэмакратычным сілам варта прапаноўваць ім альтэрнатыву, якая дазволіла б захаваць жыццё і бяспеку іх саміх і іх

сем’яў у абмен на змяненне палітычнага курсу.

Пераходзячы да транснацыянальных рэпрэсій, **Леанід Марозаў** адзначыў, што беларускі рэжым стаў больш дасканала маскіраваць палітычны пераслед у міжнародным вышуку праз Інтэрпол. Калі ў 2020 годзе выкарыстоўваліся адкрыта палітычныя артыкулы, то ў 2023–2024 гадах запыты сталі афармляцца як справы, звязаныя з эканамічнымі або наркатычнымі злачынствамі. Паводле Марозава, ужо ўдалося прадухіліць 17 выпадкаў экстрадыцыі па такіх запытах. Ён таксама паведаміў пра падрыхтоўку справаздачы адносна 11 супрацоўнікаў беларускага бюро Інтэрполу, якіх падазравалі ў фальсіфікацыі спраў, і заклікаў міжнародных партнёраў абмежаваць магчымасці Мінска выкарыстоўваць гэтую сістэму.

**Алесь Міхалевіч** адзначыў, што Інтэрпол ужо ўзмацніў праверку беларускіх запытаў, але выкарыстанне непалітычных артыкулаў істотна ўскладняе гэтую працу. Міхалевіч таксама звярнуў увагу на працэдуру, якая дазваляе Беларусі засакрэчваць інфармацыю пра міжнародны вышук, і заклікаў ліквідаваць гэтую магчымасць праз міжнародную працу. Леанід Марозаў асобна папярэдзіў беларусаў, якія маюць міжнародную абарону, што ім не варта ездзіць у Расію, Беларусь і Грузію, разлічваючы на тое, што пераследу не адбудзецца.

**Моніка Станіслава Платэк** заявіла, што рэпрэсіі ў Беларусі нагадваюць расійскую каланіяльную сістэму, а іх уплыў не абмяжоўваюцца тэрыторыяй Беларусі. Паводле Платэк, яны ўплываюць на прававыя сістэмы і бізнес еўрапейскіх краін. Спікерка таксама звярнула ўвагу на з’яву, якую назвала «бізнесам на тэрорах», і заклікала не дапусціць ператварэння рэпрэсаваных беларусаў і беларусак у інструмент палітычнага гандлю.

**Ёана Шыманьска** адзначыла, што лічбавыя атакі беларускага рэжыму нельга разглядаць як асобныя інцыдэнты. Пры гэтым міжнароднай супольнасці ўсё яшчэ не хапае каардынацыі для збору і аналізу інфармацыі пра такія атакі. Паводле яе, у выніку актывісты і арганізацыі часта вымушаныя самастойна выдаткоўваць значныя рэсурсы на кібербяспеку. Шыманьска заклікала стварыць адзіны механізм збору інфармацыі пра такія выпадкі, паколькі гэта дазволіла б лепш ацаніць рэальны маштаб транснацыянальных рэпрэсій.

**Леанід Марозаў** падкрэсліў значэнне міжнародных інструментаў, у тым ліку Групы ААН па Беларусі. **Моніка Платэк** дадала, што незалежная група экспертаў ААН рыхтуе новую справаздачу, якая можа стаць асновай для будучых судовых працэсаў. Яна таксама паведаміла, што матэрыялы для Міжнароднага крымінальнага суда ўжо былі сабраныя. **Уладзімір Лабковіч** адзначыў важнасць распачатай па ініцыятыве Літвы справы ў Міжнародным крымінальным судзе, звязанай з транснацыянальнымі злачынствамі рэжыму, і заклікаў іншыя краіны далучыцца да гэтага працэсу.

У адказ на прапанову **Аляксандры Мамаевай** (Каардынацыйная Рада) стварыць адзіную супольную службу бяспекі дэмакратычных сіл, якая аб’яднала б прадстаўнікоў Офіса, Каардынацыйнай Рады, Аб’яднанага Пераходнага Кабінета, праваабаронцаў, BELPOL і «Кіберпартызанаў», спікеры калектыўна падтрымалі такую ідэю.

На пытанне пра адмовы міграцыйных служб у абароне беларусаў на фоне меркаванай «стабілізацыі» сітуацыі **Леанід Марозаў** адзначыў, што дэмакратычныя сілы рэгулярна перадаюць польскім уладам дакументы, якія пацвярджаюць рэальныя выпадкі рэпрэсій. Пры гэтым ён прызнаў, што праблема ўзнікае і тады, калі людзі звяртаюцца па абарону, не маючы ніякіх доказаў або дакументаў. Паводле яго, Офіс Святланы Ціханоўскай гатовы кансультаваць такіх заяўнікаў і дапамагаць ім.

На заклік **Крысціны Шыянок** (Офіс беларускіх дэмакратычных сіл у Чэхіі) больш актыўна распавядаць міжнародным партнёрам пра схаваныя формы рэпрэсій, **Лабковіч** адзначыў, што рэпрэсіі працягваюцца, а праваабаронцы імкнуцца даносіць інфармацыю пра іх да міжнароднай супольнасці. **Мацвей Купрэйчык** нагадаў пра **справаздачу BELPOL і партнёраў**, у якой паказваецца рэальны маштаб рэпрэсій.

Панэль 5

# «Back to USSR ці наперад да Новай Беларусі»

## *Адукацыя. Моладзь. Будучыня*

Беларуская ідэнтычнасць сёння на вастрыі атакі з боку ідэалогіі «рускага свету» і палітыкі дзяржаўнай русіфікацыі. Асабліва гэта адчувальна на ўзроўні сістэмы адукацыі, якая найбольш задзейнічана ў пабудове ідэнтычнасці. Калі сёння адукацыя ў Беларусі — гэта інструмент дзяржаўнага ідэалагічнага кантролю і праваднік каланіяльных установак і практык, шырокамаштабных рэпрэсіяў, як павінна на гэта асіметрычна рэагаваць беларуская дэмакратычная супольнасць у эміграцыі? Беларуская дыяспара сёння — адзінае магчымае месца захавання нацыянальнай ідэнтычнасці, гуманітарных ведаў і культуры. Таму нам патрэбны поўны цыкл адукацыі на беларускай мове — ад дашкольных установаў да беларускага нацыянальнага ўніверсітэта. І ці здольны ЕГУ выканаць ролю нацыянальнага ўніверсітэта?

Які новы ўніверсітэт патрэбны Беларусі, якое месца ў ім мусяць займаць пытанні ідэнтычнасці і мовы, чаму ўніверсітэцкія праекты ў эміграцыі наогул маюць сэнс? Беларуская моладзь і акадэмічная супольнасць: ці супадаюць іх інтарэсы пры стварэнні новага ўніверсітэта? Ці можа беларускі бізнес стаць адным з фундатараў новага універсітэта ў межах місіі па падтрымцы беларускай нацыі?

**Мадэратарка: Аліна Коўшык,** *дырэктарка тэлеканала «Белсат»*

**Спікеры(-кі):**

**Святлана Мацкевіч,** *экспертка ў галіне адукацыі, «Еўрабеларусь»*

**Вадзімір Заранкін,** *старшыня рады Асацыяцыі беларускіх бацькоў у Літве, старшы супрацоўнік па праграмах «Амерыканскія рады па міжнароднай адукацыі»*

**Андрэй Лаўрухін,** *намеснік прадстаўніка па нацыянальным адраджэнні ў пытаннях адукацыі і навукі*

**Павел Церашковіч,** *дарадца Святланы Ціханоўскай па адукацыі і навуцы*

**Кацярына Васілёнак**, *медыяэкспертка*

**Вольга Павук,** *палітычная актывістка, настаўніца*

---

**Павел Церашковіч** заявіў, што беларуская сістэма адукацыі перажывае глыбокі крызіс. Ён адзначыў рост мілітарызацыі і ідэалагічнай індактрынацыі: у краіне створана больш за 600 ваенна-патрыятычных клубаў, а старшакласнікі праходзяць ваенныя зборы. Адначасова ўзмацнілася русіфікацыя: беларускамоўныя школы штогод губляюць ад 3 да 5 тысяч вучняў, а па Беларусі распаўсюджваецца сетка расійскіх арганізацый. Ён таксама звярнуў увагу на маштаб рэпрэсій у сістэме: за пяць гадоў адукацыя страціла каля 13 тысяч настаўнікаў, а ў вышэйшай школе колькасць выкладчыкаў з навуковымі ступенямі істотна скарацілася.

**Андрэй Лаўрухін** пагадзіўся з гэтай ацэнкай і дадаў, што якасць адукацыі непасрэдна залежала ад людзей, аднак галоўным крытэрыем адбору кадраў стала палітычная лаяльнасць. Ён адзначыў, што ў сістэме была ўведзена псіхалагічная праверка настаўнікаў для выяўлення тых, хто недастаткова лаяльны ўладзе. На яго думку, у такіх умовах немагчыма развіваць чалавечы і сацыяльны капіталы краіны.

**Вольга Павук** асобна падкрэсліла праблему ізаляцыі дзяцей ад знешняга свету. Яна заявіла, што частка настаўнікаў фактычна стала інструментам дзяржаўнай ідэалогіі, а адукацыйны працэс усё больш замыкаецца на Беларусі і Расіі. Паводле яе, у навучальныя праграмы пранікала ваенная тэматыка, а стаўленне да вывучэння англійскай мовы ў дзяржаўных моладзевых структурах стала варожым. У якасці практычнай меры Павук прапанавала стварыць для бацькоў партал з псіхалагічнай і практычнай дапамогай, бо менавіта на бацьках ляжыць цяжар выхавання дзяцей насуперак гэтай сістэме.

**Вадзімір Заранкін** не пагадзіўся з меркаваннем, што захаваць нацыянальную ідэнтычнасць сёння магчыма толькі ў дыяспары. Ён адзначыў, што і ў Беларусі дзеці працягваюць вывучаць беларускую мову, літаратуру і гісторыю, хоць у эміграцыі бацькам значна складаней забяспечваць такую адукацыю. Заранкін таксама распавёў пра барацьбу за захаванне беларускай дзяржаўнай гімназіі імя Францыска Скарыны ў Вільнюсе. Ён адзначыў, што дзякуючы мабілізацыі бацькоў і падтрымцы Офіса Святланы Ціханоўскай удалося не дапусціць, каб новыя міграцыйныя правілы заблакавалі набор дзяцей у першы клас з беларускамоўным навучаннем. Ён заклікаў зрабіць беларускую мову мовай навукі, тэхналогій і дыпламатыі, дапамагчы маладым беларусам паспяхова інтэгравацца ў краінах пражывання. Пры гэтым ён звярнуў увагу на недахоп сучасных беларускіх падручнікаў і заклікаў ствараць новую вучэбную літаратуру па-беларуску.

**Андрэй Лаўрухін** падтрымаў ідэю стварэння альтэрнатыўных электронных адукацыйных матэрыялаў па гісторыі, літаратуры, філасофіі і праве. Ён таксама заклікаў донараў падтрымліваць доўгатэрміновыя інстытуцыйныя праекты, а не кароткія гранты на некалькі месяцаў.

Асобная частка дыскусіі была прысвечаная **Еўрапейскаму гуманітарнаму ўніверсітэту**. Яго выпускніца **Кацярына Васілёнак** раскрытыкавала ЕГУ, адзначыўшы, што паступала туды ў 2021 годзе як ва «ўніверсітэт у выгнанні», дзе пераважную большасць студэнтаў складалі беларусы. Паводле яе, цяпер універсітэт страціў гэты статус і не забяспечвае належнай абароны студэнтаў(-к). У выніку Васілёнак сказала, што ЕГУ больш нельга разглядаць як беларускі ўніверсітэт у выгнанні. Ён не адпавядае сваёй місіі развіцця грамадзянскай супольнасці.

**Андрэй Лаўрухін** не пагадзіўся з падыходам да размеркавання рэсурсаў і адзначыў, што донары аддаюць перавагу фінансаванню аднаго ЕГУ, выдзяляючы яму каля 3 млн еўра штогод. Паводле яго, у выніку значная частка іншых адукацыйных ініцыятыў да 2026 года фактычна спыніла працу. Лаўрухін таксама звярнуў увагу на тое, што беларусаў паступова выціснялі з кіраўніцтва ЕГУ: колькасць факультэтаў скарацілася з пяці да двух, а ў вышэйшым кіраўніцтве ўніверсітэта не засталося беларусаў.

**Святлана Мацкевіч** падзялілася меркаваннем, што ЕГУ можа працягваць існаваць у цяперашнім фармаце. Пры гэтым яна падкрэсліла, што адна інстытуцыя не здольная супрацьстаяць маштабнай сістэме мілітарызацыі і ідэалагізацыі адукацыі. На яе думку, праблема шырэйшая: з прыкладна 150 адукацыйных ініцыятыў за мяжой да гэтага часу не была створаная адзіная адукацыйная экасістэма. Яна таксама звярнула ўвагу на недастатковасць рэсурсаў для стварэння даследчыцкага ўніверсітэта імя Валовіча і іншых адукацыйных ініцыятыў. Разважаючы пра развіццё адукацыі, Мацкевіч вылучыла тры прыярытэты для развіцця адукацыі: стварэнне самастойнай акадэмічнай супольнасці, падрыхтоўку спецыялістаў для будучых рэформаў і масавае зніжэнне функцыянальнай непісьменнасці праз працу медыя, лідараў меркаванняў і грамадзянскай супольнасці.

**Павел Церашковіч** назваў ЕГУ «каланіяльным універсітэтам» і заклікаў донараў скараціць фінансаванне малаэфектыўных трэнінгаў і стратэгічных сесій, перанакіраваўшы сродкі на рэальныя адукацыйныя праекты. Пры гэтым ён прызнаў, што змяненні ва ўніверсітэце ўсё яшчэ магчымыя, калі ў яго кіраўнічыя органы ўвойдуць прадстаўнікі беларускіх дэмакратычных сіл, навукоўцы і студэнты.

У частцы пытанняў з залы **Таццяна Крапінэвіч**, настаўніца матэматыкі, адзначыла, што многія педагогі, нягледзячы на ціск сістэмы, працягваюць сумленна працаваць. Яна таксама звярнула ўвагу на адсутнасць належнай юрыдычнай дапамогі і фондаў для настрыфікацыі дыпломаў беларускіх настаўнікаў, якія выехалі за мяжу. **Андрэй Лаўрухін** у адказ прапанаваў стварыць інстытут «амбасадараў адукацыі», які мог бы аказваць прававую падтрымку беларускім выкладчыкам за мяжой, а таксама асобны фонд дапамогі.

Панэль 6

# «Беларусы/кі — народ без дзяржавы»

## *Сацыяльная дапамога. Мабільнасць. Легалізацыя*

Беларуская дзяржава перастала выконваць базавыя абавязкі перад значнай часткай сваіх грамадзянаў, а ў многіх выпадках сама стала крыніцай пагрозы. У выніку беларуская супольнасць вымушана ствараць элементы ўласнай сістэмы сацыяльнай абароны па-за дзяржавай і праз нацыянальныя межы. Ці можам мы перайсці ад разрозненай салідарнай дапамогі да беларускай транснацыянальнай сістэмы сацыяльнай абароны, якая працуе і для людзей унутры краіны, і за мяжой?

**Мадэратарка: Кацярына Ерусалімская,** *журналістка, вядучая «Маланка Медыя»*

**Спікеры(-кі):**

**Аляксандр Клачко,** *былы добраахвотнік, сузаснавальнік ініцыятывы «Росквіт» дабрачыннай арганізацыі «KUS»*

**Альвіна Мінгазава,** *юрыстка Free Belarus Center, былая адвакатка*

**Сяргей Драздоўскі,** *праваабаронца, Офіс па правах людзей з інваліднасцю*

**Зміцер Ягораў,** *прадстаўнік Фонду BYSOL*

**Вераніка Станкевіч,** *каардынатарка ініцыятывы «Вольныя»*

**Алена Агарэлышава,** *сацыялагіня, экспертка па гендарных пытаннях і правах жанчын, сузаснавальніца «Фемгруппы Беларусь»*

**Вольга Зазулінская,** *прадстаўніца Аб'яднанага Пераходнага Кабінета па сацыяльнай палітыцы*

---

**Вераніка Станкевіч** пачала дыскусію з тэмы дапамогі былым палітзняволеным. Паводле яе, вызваленне палітвязняў — гэта толькі пачатак доўгай рэабілітацыі, бо людзі выходзяць пасля працяглых тэрмінаў з цяжкімі праблемамі са здароўем, псіхалагічнымі траўмамі, без дакументаў, прафесіі і ведання мовы. Яна падкрэсліла, што беларускае грамадства здолела пабудаваць уласную незалежную сістэму падтрымкі былых палітвязняў і іх сем'яў, і гэтую мадэль трэба захоўваць ды пашыраць на іншыя ўразлівыя групы. Спікерка дадала, што ў 2026 годзе ініцыятыва зрабіла акцэнт на прафарыентацыю, перанавучанне і моўныя курсы, каб забяспечыць паўнавартасную прафесійную інтэграцыю вызваленых.

**Аляксандр Клачко** сказаў, што сістэмная дапамога былым добраахвотнікам і іх сем'ям фактычна адсутнічае і трымаецца толькі на прыватных зборах. Стварыць сістэму ўскладняе тое, што еўрапейскія донары памылкова не ўспрымаюць добраахвотнікаў як «гуманітарны выпадак». Ён адзначыў адсутнасць выплат сем'ям загінулых з боку Украіны, адсутнасць легальнага статусу ветэранаў у Польшчы і Літве, а таксама звярнуў увагу на невядомы лёс беларускіх палонных «Кляшча» і «Тромблі». Клачко заклікаў далучацца да **зборy** на патрэбы байцоў. Мадэратарка Кацярына Ерусалімская дадала, што ў Літве грамадства ставіцца да добраахвотнікаў з насцярожанасцю, і гэты бар'ер трэба пераадольваць праз працу з мясцовымі палітыкамі.

**Вольга Зазулінская** пагадзілася з важнасцю тэмы добраахвотнікаў і дадала, што за апошнія

два гады адбыўся пазітыўны здвіг у дыскусіях на гэту тэму. Яна паведаміла, што супольнымі высілкамі атрымалася атрымаць грантавую падтрымку на адміністрацыйны рэсурс Асацыяцыі ветэранаў і ініцыятывы «Росквіт», а таксама арганізаваць для добраахвотнікаў бясплатную карэкцыю зроку ў Кіеве.

**Сяргей Драздоўскі** заявіў, што інваліднасць значна ўскладняе ўсе працэсы эміграцыі, а эўрапейскае заканадаўства па ўцекачах прапісанае пад «маладога і моцнага», таму чалавек з інваліднасцю застаецца «небачным» для мясцовай сістэмы. Ён адзначыў, што патрэбны сацыяльны куратар-праваднік накшталт сістэмы доўгатэрміновай падтрымкі былых палітзняволеных. Ён таксама дадаў, што ўнутры Беларусі профільныя арганізацыі вычысцілі ад праваабаронцаў, а за мяжой у беларусаў застаецца псіхалагічны бар'ер, праз які яны з-за незнання мовы не звяртаюцца па дапамогу, хоць маюць на яе права.

**Алена Агарэлышава** адзначыла, што трэць беларускіх сем'яў складаюць маці-адзіночкі, і рэпрэсіі толькі пагаршаюць гэтую сітуацыю. Яна дадала, што жанчыны сутыкаюцца з экстрэнай эвакуацыяй і «другой зменай» па даглядзе дзяцей, а мужчыны часта вымушаныя пагаджацца на цяжкую фізічную працу дзеля заробку. Што да харассменту і хатняга гвалту, спікерка заклікала дэмакратычныя сілы адкрыта асуджаць гвалт, а пацярпелым звяртацца ў мясцовыя шэлтары і беларускія арганізацыі.

**Альвіна Мінгазава** звярнула ўвагу, што праблема пратэрмінаваных пашпартоў становіцца крытычнай: без дакументаў людзі губляюць працу, рахункі ў банках і магчымасць падарожнічаць, а працадаўцы часта пагражаюць звальненнем. Яна дадала, што пенсіянеры-актывісты сутыкаюцца з сумневамі з боку польскага ZUS адносна працоўнага стажу, і юрысты дапамагаюць абскарджваць такія рашэнні ў судзе. Таксама яна адзначыла скарачэнне донарскага фінансавання на юрыдычную дапамогу. З іншага боку, яна супакоіла аўдыторыю, што сітуацыя з адмовамі ў міжнароднай абароне не такая крытычная, як падаецца ў медыя, але заклікала падаваць больш абгрунтаваныя заяўкі і пры неабходнасці звяртацца да юрыстаў.

**Зміцер Ягораў** заявіў, што фонд BYSOL працягвае дапамагаць пацярпелым ад рэпрэсій, аднак прасоўваць ананімныя зборы ўнутры Беларусі становіцца складаней праз падзенне даверу аўдыторыі да схаваных імёнаў, хоць такія меры бяспекі застаюцца неабходнымі. Аднак спікер падзяліўся, што фонд штомесяц фіксуе больш за 1000 ахвяраванняў, дзе сярэдні донат складае 30 еўра. Гаворачы пра межы дапамогі, Ягораў патлумачыў, што мандат BYSOL пакрывае толькі экстраную дапамогу тым, хто наўпрост пакутуе ад рэпрэсій, але гэта толькі кропля ў моры. Ён дадаў, што людзі часта выходзяць з турмы са зруйнаваным здароўем і не могуць працаваць фізічна, таму выплата ў 1000 еўра не здольная вырашыць іх доўгатэрміновыя праблемы. Як шлях да вырашэння гэтых выклікаў спікер назваў «радыкальную празрыстасць» — справаздачы па ўсіх 1500 зборах даступныя ў архіве фонда — і дэманстрацыю рэальных гісторый поспеху.

Напрыканцы **Вольга Зазулінская** дадала, што адзіная маршрутызацыя дапамогі ўжо існуе на сайтах Святланы Ціханоўскай і Аб'яднанага Пераходнага Кабінета, а арганізацыі пры неабходнасці перанакіроўваюць заяўцаў адна да адной. Таксама запушчаны праект «Раёнка» і плануецца стварэнне рэгіянальных інфармацыйных цэнтраў. Яна падкрэсліла, што галоўнай перашкодай для дапамогі сёння згадваецца зніжэнне ўзаемнага даверу і абвінавачванні ўнутры супольнасці, таму важна захоўваць адзінства і памятаць пра першапрычыну праблем — рэпрэсіі.

Панэль 7

# «Зрабіць немагчымае»

## *Медыя. Аўдыторыі. Даследаванні*

Незалежныя медыя і даследчыкі сёння працуюць ва ўмовах татальных блакіровак, фінансавага крызісу і стомленасці аўдыторыі. Галоўны выклік — як бяспечна дастукацца да людзей унутры краіны і эфектыўна змагацца з расійскай прапагандай. На панэлі абмяркуем новыя супольныя фарматы працы, спосабы дастаўкі інфармацыі і тое, як захаваць сувязь паміж беларусамі па абодва бакі мяжы.

**Мадэратарка: Вольга Лойка,** *галоўны рэдактар Plan B, былая палітзняволеная*

**Спікеры(-кі):**

**Паўлюк Быкоўскі,** *медыяэксперт*

**Андрэй Бастунец,** *старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў*

**Сцяпан Пуціла,** *стваральнік медыяпраекта NEXTA*

**Кацярына Андрэева,** *журналістка «Белсат», былая палітзняволеная*

---

**Андрэй Бастунец** распавёў пра беспрэцэдэнтны і штодзённы ціск, з якім сутыкаюцца незалежныя сродкі масавай інфармацыі ў Беларусі. Ён адзначыў, што практычна ўсе вядомыя незалежныя медыя, а таксама сама Беларуская асацыяцыя журналістаў, былі афіцыйна прызнаны ўладамі «экстрэмісцкімі фармаваннямі». Спікер падкрэсліў, што крымінальны пераслед журналістаў працягваецца: каля 100 прадстаўнікоў медыясектара абвешчаны ў міжнародны розшук, многія з іх сутыкаюцца з трансгранічнымі рэпрэсіямі. Тым не менш, нягледзячы на такія складаныя ўмовы і пастаянную небяспеку, Андрэй Бастунец асабліва звярнуў увагу на высокую кансалідацыю, выключную ўстойлівасць і здольнасць да працы, якія прадэманстраваў беларускі незалежны медыясектар.

**Паўлюк Быкоўскі** дапоўніў яго сацыялагічнымі данымі і сказаў, што незалежныя медыя захоўваюць масавыя ахопы ў Беларусі: 31,9% гарадскога насельніцтва дэкларуюць кантакт з імі, а з восені 2024 па восень 2025 года колькасць праглядаў незалежных медыя вырасла да 448 мільёнаў (+168 млн) дзякуючы кароткім відэа ў TikTok і YouTube Shorts. Ён дадаў, што 92% лаяльнай аўдыторыі такіх медыя не падтрымліваюць вайну, а 67% маюць праеўрапейскую арыентацыю, і падкрэсліў, што падтрымка сектара — гэта важная інвестыцыя ў інфармацыйную бяспеку рэгіёна.

**Кацярына Андрэева** змясціла фокус на бяспеку ды этыку і сказала, што за кратамі ў Беларусі застаюцца больш за 20 прадстаўнікоў медыя, а вызваленыя сутыкаюцца з ціскам на сем'і. Яна заўважыла, што каля 80% аўдыторыі «Белсат» глядзяць яго з Беларусі, таму прапанавала распрацаваць новы этычны пратакол бяспекі для рэдакцый у выгнанні (змяненне голасу, размыццё дэталяў на відэа). Яна акрэсліла і іншы выклік, што стаіць перад сектарам, – фінансаванне. Тым не менш, яна заклікала шукаць магчымасці манетызацыі кантэнта і стварэння праектаў для маладых журналістаў.

**Сцяпан Пуціла** распавёў, што фінансаванне з боку донараў скарачаецца альбо стагнуе, таму галоўнай задачай застаецца эфектыўнасць кожнага еўра. Ён заўважыў, што аўдыторыя масава пераходзіць у соцсеткі (лідары — TikTok і YouTube), і прывёў у прыклад праекты Nexta Live і Nexta Plus, якія лідзіруюць па праглядах у расійскамоўным YouTube, а за ліпень беларускія каналы Nexta сабралі 40 мільёнаў праглядаў непасрэдна з Беларусі.

Адказваючы на пытанне **Арцёма Брухана** пра ўплыў расійскіх медыя, да якога мадэратарка **Вольга Лойка** ўзгадала такую праблему, як перацягванне беларускіх кадраў у расійскія праекты праз лепшае фінансаванне, **Паўлюк Быкоўскі** пагадзіўся з наяўнасцю такога ўплыву, але дадаў, што прапарцыйна ўплыў беларускіх СМІ ўнутры краіны значна вышэйшы, чым у расійскіх ліберальных медыя ў РФ. **Сцяпан Пуціла** дадаў, што расійская дзяржава дадаткова фінансуе свае медыя і проксі-каналы, кантэнт якіх карыстаецца попытам у беларусаў, і гэта падкрэслівае недахоп фінансавання беларускіх медыя.

Каментуючы пытанне журналіста **Тараса Тарналіцкага** пра кадравы тупік і заклік журналісткі і былой палітзняволенай **Ксеніі Луцкіной** падтрымаць вызваленых журналістаў, **Андрэй Бастунец** распавёў пра адукацыйныя курсы кшталту «Універсітэта па суботах», але дадаў, што праз скарачэнне фінансавання рэдакцыі скарачаюць штаты і не могуць наймаць новых людзей ці калег з турмаў. **Аліна Коўшык** з «Белсат» з залы дадала, што іх канал імкнецца працаўладкоўваць былых палітвязняў, але заклікала да больш жорсткага лабіявання фінансавання беларускага медыясектара на міжнародным узроўні.

